# У Гародні прэзентавалі "Новы замак"

Вечарына, прысвечаная выхаду літаратурнага альманаха "Новы замак", адбылася 21 сакавіка ў канферэнц-зале Гарадзенскай абласной бібліятэкі імя Я. Карскага, што месціцца ў адметным гістарычным месцы - у Новым зам-







ку. На вечарыне присутнічалі літаратары і неабыякавыя да прыгожага пісьменства госці.

У альманах увайшлі паэзія, проза, пераклады, а таксама крытыка і хроніка літаратурнага жыцця Гародні мінулага года. Прафесар Купалаўскага ўніверсітэта Аляксей Пяткевіч кажа, што альманах "Новы замак" адпавядае форме жанру альманаха, у якім павінны прысутнічаць новыя імёны, якіх там багата.

- Ён прадугледжвае разнастайнасць імёнаў. Пры самым беглым пераглядзе нашага альманаха, ён робіць добрае ўражанне багаццем імёнаў. Імёны - гэта людзі, якіх мы нават ведаем, але ў дадзеным выпадку адкрываем іх з нечаканага боку, як аўтараў публікацый у гарадзенскім альманаху. І таму імёны, імёны, імёны - вось, што важна для альманаха.

Вядоўцай вечарыны была даследчыца і выкладчыца Ала Петрушкевіч.

З прамовай выступіў Ігар Жук, у аўтарскім выкананні прагучалі вершы Дануты Бічэль, Мечыслава Курыловіча, Ганны Аўчыннікавай, Анатоля Брусевіча.

Студэнты-філолагі ўніверсітэта імя Янкі Купалы падрыхтавалі дэкламацыю твораў гарадзенскіх літаратараў - іх выступ стаў прыемным сюрпрызам для ўсіх прысутных. Яны як найбольш актыўныя ўдзельнікі вечарыны заслужана атрымалі прэзенты ад кампаніі "Будзьма беларусамі", пры падтрымцы якой адбылася імпрэза.

У альманаху змясцілі свае творы як знаныя аўтары, так і не вядомыя шырокаму колу чытачоў. Асобныя гарадзенскія паэты на старонках альманаха спрабуюць сябе ў прозе. Сярод 21 аўтара ёсць твор ужо адышоўшага ў іншы свет Юрыя Гумянюка.

А гарадзенскія літаратары ўжо задумваюць працу над чарговым, гадавым альманахам.

*Якуб Сушчынскі,*
*Беларускае Радыё Рацыя.*